ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наваполацкага гарадского выканаўчага камітэта
________________ Н.М.Марчанка
« ____» ____________ 2017 г.

Палажэнне
аб правядзенні гарадскога конкурсу
самаробнай кнігі,
прымеркаванага да 500-годдзя
беларускага кнігадрукавання
і Дня беларускага пісьменства ў г.Полацку

1. Агульныя палажэнні

1.1 Дадзенае Палажэнне вызначае парадак і ўмовы правядзення гарадскога конкурсу самаробнай кнігі (далей - Конкурс).

1.2 Конкурс праводзіцца ў рамках абласной выставы-агляду самаробнай кнігі, прымеркаванай да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і Дня беларускага пісьменства ў г.Полацку.

1.3 Арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наваполацкага гарадскага выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г.Наваполацка”, Наваполацкая гарадская арганізацыя грамадскага аб’яднання “Беларускі фонд міру”, Наваполацкая гарадское аб’яднанне прафсаюзаў.

2. Мэты і задачы Конкурса

2.1 Конкурс праводзіцца з мэтай папулярызацыі кнігі і чытання пасродкам нестандартнага злучэння майстэрства стварэння кнігі і прыкладной мастацкай творчасці, далучэння насельніцтва г.Наваполацка да творчай актыўнасці.

2.2 Асноўнымі задачамі з'яўляюцца:

-папулярызацыя чытання як адной з важнейшых складаючых маральна-духоўнага, эстэтычнага выхавання;

-рэалізацыя крэатыўнага патэнцыялу карыстальнікаў бібліятэк;

-арганізацыя змястоўнага вольнага часу, садзейнічанне сатворчасці дзяцей і дарослых.

3. Кіраўніцтва правядзеннем Конкурсу

3.1 Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Конкурсу ажыццяўляе Аргкамітэт, які ствараецца арганізатарамі. Аргкамітэт вырашае бягучыя пытанні арганізацыі і правядзення Конкурсу.

4. Арганізацыя і парадак правядзення Конкурсу

4.1 Удзельнікам Конкурсу можа выступаць любы жыхар г.Наваполацка (у тым ліку і супрацоўнікі бібліятэк) або аўтарскі калектыў.

4.2 Работы на Конкурс прымаюцца з 15 красавіка – па 10 чэрвеня 2017 года ў цэнтральнай бібліятэцы імя У.Маякоўскага (вул. Калініна,1)

4.3 Конкурс на лепшую самаробную кнігу праводзіца па наступных намінацыях:

“Лешпае мастацкае афармленне твораў беларускай літаратуры”;

“Лепшае мастацкае афармленне твораў дзіцячай літаратуры” (беларуская, руская, замежная, сусветная літаратура);

“Лепшае мастацкае афармленне твораў пісьменнікаў і паэтаў Віцебшчыны”;

“Лепшае мастацкае афармленне кнігі краязнаўчага накірунку, створанай самастойна” (беларуская, руская, замежная мова).

Дапускаецца афармленнс мастацкага твора цалкам або яго ўрыўка.

4.4 Разам з конкурснай работай у цэнтральную бібліятэку імя У.Маякоўскага (вул. Калініна,1) накіроўваецца заяўка са звесткамі пра аўтара (калектыў аўтараў): прозвішча, імя, імя на бацьку, дата нараджэння, месца вучобы (клас і г.д.) або месца работы (пасада), месца жыхарства, кантактныя тэлефоны, адрас электроннай пошты. У заяўцы павінна быць указана намінацыя, паводле якой выканана работа (Дадатак).

5. Асноўныя патрабаванні да работ

5.1 Асноўнымі патрабаваннямі да работ з’яўляюцца:

- у структуры кнігі павінны абавязкова прысутнічаць вокладка, тытульны ліст , змест;

- фармат кнігі не павінен перавышаць за фармат А3;

- матэрыялы могуць быць падрыхтаваны з прымяненнем любога матэрыялу і тэхнікі, за выключэннем камп’ютарных тэхналогій.

5.2 Да ўдзелу ў Конкурсе не дапускаюцца матэрыялы ў канцэлярскіх папках, фотаальбомах з файламі, сшытках і г.д.

6. Крытэрыі ацэнкі творчых работ

6.1 Конкурсныя работы ацэньваюцца адпаведна наступных крытэрыяў:

- арыгінальнасць ідэі;
- пісьменнасць, дакладнасць зместу кнігі;
- наяўнасць ілюстрацый;
- разнастайнасць выкарыстаных тэхнік;
- мастацкае афармленне работы.

7. Падвядзенне вынікаў

7.1. Журы падводзіць вынікі Конкурсу не пазней 15 чэрвеня.

7.2. Па выніках Конкурсу пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі і прызамі.

7.3. Аргкамітэт мае права ініцыіраваць увядзенне дадатковых прызавых месцаў з мэтай заахвочвання ўдзельнікаў.

7.4. Фотаздымкі лепшых самаробных кніг будуць размешчаны на афіцыйным сайце горада Наваполацка і сайце дзяржаўнай ўстановы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г.Наваполацка”.

7.5. Работы - пераможцы вылучаюцца да ўдзелу ў абласной выставе-аглядзе самаробнай кнігі, прымеркаванай да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і Дня беларускага пісьменства ў г.Полацку.

7.6. Абласная выстава-агляд самаробнай кнігі пройдзе ў верасні 2017 года ў г.Полацку падчас святкавання Дня беларускага пісьменства.

УЗГОДНЕНА
Дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г.Наваполацка”
________________ Н.М.Наважылава
«___» ______________ 2017г.

УЗГОДНЕНА
Старшыня Наваполацкай гарадской арганізацыі грамадскага аб’яднання “Беларускі фонд міру”
__________________ У.Я.Бяляеў
«___» ______________ 2017г.

УЗГОДНЕНА
Старшыня Наваполацкага гарадскога аб’яднання прафсаюзаў
________________ А.Д.Гарохава
«___» ______________ 2017г.

Дадатак

АРГКАМІТЭТ

| | |
|---|---|
| **Марчанка** Наталля Міхайлаўна | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наваполацкага гарадскога выканаўчага камітэта |
| **Наважылава** Надзея Міхайлаўна | дырэктар дзяржаўнай ўстановы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г.Наваполацка” |
| **Бяляеў** Уладзімір Яўгенавіч | старшыня Наваполацкай гарадской арганізацыі грамадскага аб’яднання “Беларускі фонд міру”. |
| **Гарохава** Анастасія Дзмітрыеўна | старшыня Наваполацкага гарадскога аб’яднання прафсаюзаў |
| **Тарасікава** Аксана Сямёнаўна | дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі “Дзіцячая мастацкая школа імя І.Ф.Хруцкага г.Наваполацка” |